Каляндар
знамянальных і памятных дат і падзей Жлобіншчыны
на 2027 год

Календарам знамянальных і памятных дат належыць асобая роля ў распаўсюджванні гістарычных звестак аб тым ці іншым краі, людзях, якія яго праслаўлялі, гарадах і вёсках, фабрыках і заводах, установах навукі, культуры, адукацыі. Яны ўваходзяць у склад краязнаўчых рэкамендацыйных даведачных дапаможнікаў і прызначаны перш за усё бібліятэчным работнікам у дапамогу іх шматграннай краязнаўчай дзейнасці, работнікам сродкаў масавай інфармацыі і музеяў, а таксама ўсім, каго цікавщь гісторыя і сучаснасць роднага краю. Матэрыялы ***«Календара...»*** даступныя як для спецыяліста, так і для масавага чытача.

Супрацоўнікі Жлобінскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Н.К. Крупскай штогод выдаюць ***«Каляндар знамянальных і памятных дат і падзей на ...*** *год».* У ім адзначаюцца звычайна так званыя «круглыя» даты (150-годдзе, 100-годдзе, 50-годдзе і г.д.). Разам яны адлюстроўваюць падзеі і факты гісторыі, грамадскага, палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця Жлобіншчыны, юбілейныя даты дзеячоў, жыццё ці дзейнасць якіх звязана з краем.

Адбор юбілейных дат рабіўся ў адпаведнасці з іх значнасцю для гісторыі, грамадскага жыцця, эканомікі, навукі і культуры. У «Каляндар...» уключаюцца наступныя найбольш значныя даты:

- важнейшыя гістарычныя падзеі на тэрыторыі вобласці;
- падзеі, звязаныя з дзейнасцю палітычных партый і грамадскіх арганізацый;
- помнікі прыроды, гісторыі і культуры;
- вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы;
- бібліятэкі, выдавецтвы, старэйшыя перыядычныя выданні;

- тэатры, музеі, творчыя саюзы і калектывы;
- прадпрыемствы і інш.

Уключаецца таксама інфармацыя аб персаналіях, якія прадстаўляюць гістарычны, навуковы ці сацыяльны інтарэс:

- выдатныя мясцовыя дзеячы;
- асобы, знаходжанне якіх у краі пакінула адметны след;
- ураджэнцы краю, якія праславілі Жлобіншчыну за яе межамі.

Пры гэтым указваецца сфера дзейнасці асобы, а пры наяўнасці інфармацыі — вучоная ступень, належнасць да грамадскіх аб'яднанняў, заслугі перад грамадствам (звесткі аб ганаровых прэміях, лаўрэацкіх званнях і г. д.), гады жыцця. Інфармацыя пра ўраджэнцаў раёна дадаткова, уключае месца нараджэння асобы.

Асноўнай крыніцай для выяўлення дат пры складанні “Календара…” з'яўляецца кніга “Памяць: Жлобін і Жлобінскі раён”|, а таксама энцыклапедычныя выданні па розных галінах ведаў, агульныя календары знамянальных і памятных дат, падшыўкі мясцовай газеты “Новы дзень”, біяграфічныя слоўнікі і дапаможнікі, тэматычныя папкі.

Матэрыялы ў «Календары... » падаюцца па новым каляндарным стылі і размешчаны па месяцах і чыслах. Выключэнне састаўляюць толькі тыя матэрыялы, у якіх не ўстаноўлена дакладная дата (месяц і чысло). Такія матэрыялы размяшчаюцца ў пачатку календара па гадах.

У 2027 годзе спаўняецца:

- **125** год (1902-1916) з пачатку правядзення **Пецярбурска-Адэскай чыгуначнай дарогі.**
- **65** год з дня стварэння (1962) хора раеннага Дома культуры. Арганізатар і кіраўнік заслужаны работнік культуры Беларусі Г. Станіслававa (з 1962г. па 2019г.)
- **60** год з пачатку дзейнасці (1967) на базе райпрамкамбіната Жлобінскай **мэблевай фабрыкі** па вытворчасці кухоннай мэблі.
- **60** год з дня узнагароджання (1967) ордэнам Леніна калгаса “Расвет” (в. Майскае).
- **75 год** з дня адкрыцця (1957) **Жлобінскай раеннай бальніцы**, */цяпер Установа аховы здароўя «Жлобінская цэнтральная раённая бальніца»* /.
- **220** гадоў з часу пабудовы (1807**) Стрэшынскай Пакроўскай царквы** ў г.п.Стрэшын Жлобінскага раёна, помніка архітэктуры класіцызму рэспубліканскага значэння.
- **125** гадоў з часу (1902), калі была пабудавана **царква ў імя Усіх Святых у в.Пірэвічы.**
- **105** гадоў з дня нараджэння **Белянкова Міхаіла Якаўлевіча** (1922 - 1993, в.Пірэвічы), заслужанага настаўніка Беларусі (1964).
- 50 гадоў з часу адкрыцця (1977) У.П.Ксяндзовым археалагічнага помніка – гарадзішча Жалезнага веку Атрубы каля в.Атрубы.
- 50 гадоў з часу (1977), калі былі выяўлены і даследаваны У.П. Ксяндзовым **археалагічныя помнікі “Шчытнае”** – паселішчы і стаянка каменнага веку каля в.Шчытнае Жлобінскага раёна.
- 50 гадоў з часу заснавання (1977) **Жлобінскага дзяржаўнаўнага прафесійнага тэхналагічнага каледжа** як сельскага прафесійна-тэхнічнага вучылішча.

С Т У Д З Е Н Ь

- 40 год з дня стварэння (1987) ААА “**Белагропромбанк”**, /да красавіка 2000 г. – “Агропромбанк”/.

1 – 80 гадоў з дня нараджэння (1947) **Байкачовай Тамары Пятроўны**, заслужанай настаўніцы БССР (1990), працавала дырэктарам СШ №10 г.Жлобіна.

1 - 100 гадоў з дня нараджэння (1927) **Елісеева Андрэя Сяргеевіча**, Старшыні Савета Ветэранаў гарадскога Савета.

4 – 75 гадоў з дня нараджэнняч (1952- 2016) **Рагаўцова Васіля Іванавіча**, мовазнаўца, паэта, педагога члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, Заслужаны работнік адукацыі, ураджэнец г.п. Стрэшын.

13 – 145 гадоў з дня нараджэння (1882-1917) **Казятнікава Пятра Іванавіча,** удзельніка руска-японскай вайны (1905), узнагароджаны Георгіеўскімі крыжамі, ордэнамі святой Ганны, святога Станіслава, ураджэнца в. Малыя Рагі.

14 –110 гадоў з дня нараджэння **Ішу Георгія Мірзавіча** (1907-1968), шахматыста (з 30-х гадоў пражыў у г. Жлобіне, першы пасляваенны чымпіён г.Жлобіна па шахматам).

14 – 100 гадоў з дня нараджэння (1927) **Кірычэнка Паўла Якаўлевіча**, члена беларускага Саюза журналістаў, былога рэдактара раённай газеты “Камуніст”.

26 – 90 гадоў з дня нараджэння **Качаргіна Анатоля Іванавіча** (.26.01.1937 - жнівень 2018 г.Жлобін), беларускага вучонага ў галіне тэхналогіі машынабудавання, прафесар.

28 – 25 гадоў з часу (28.01.2002), калі **герб і флаг г.Жлобіна** быў зарэгістрыраваны ў гербавым матрыкуле Рэспублікі Беларусь (№80).

Л Ю Т Ы

8 – 60 гадоў з дня нараджэння (1967-1987**) Касцяйкова Мікалая Яўгенавіча**, удзельніка вайны ў Афганістане, ураджэнца в.Рэкта. Пасмяротна узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

15 - Дзень памяці воінаў-інтэрнацыянастаў Беларусі

15 – 75 гадоў з дня нараджэння (1952) **Арлова Леаніда Васільевіча**, кандыдата эканамічных навук, ураджэнца г. Жлобіна.

15 –35 гадоў з дня адкрыцця (1992) **Жлобінскага дзяржаўнага гісторыка-краязнаўчага музея.**

18 – 135 гадоў з дня нараджэння **Максіма Скрыганава**, (1892- 1951гг. В.Цупер Майскі савет Жлобінскі раён), ваенны дзеяч, удзельнік лядовага пераходу караблёў савецкага флоту ў Хельсінкі, контр-адмірал.

С А К А В І К

- 110 гадоў з дня стварэння (1917) стварэння Савета рабочых і сялян у Жлобіне.
- 85 гадоў з дня узнікнення (1942) **ў Жлобіне падпольнай групы** пад кіраўніцтвам І.І. Цыркунова .

8 – 85 гадоў з дня растрэла (1942) гітлераўцамі каля **в. Шчадрын больш за тысячу мясцовых яўрэяў,** камсамольцаў, савецкіх актывістаў.

19 – 45 гадоў з дня падпісання (1982) кантракта на будаўніцтва Беларускага металургічнага завода ў г. Жлобіне, якое ажыццявілі аўстрыйская фірма “Фест-Альпіне” і італьянская “Даніэлі”.

20 – 100 гадоў з дня нараджэння (1927) **Жычка Хведара Дзмітрыевіча**, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, беларускага пісьменніка, ураджэнца п.Марс Жлобінскага раёна.

К Р А С А В І К

- 110 гадоў з дня стварэння (1917) ў Жлобіне **бальшавіцкай ячэйкі**. На прадпрыемствах устанаўліваецца 8-гадзінны працоўны дзень.

1 – 35 гадоў з дня стварэння (1992) **АА “Компаньон**” .

11- Міжнародны дзень вызвалення вязняў фашысцкіх канцлагераў

12 – 85 гадоў з дня растрэла (1942) нямецка-фашысцкімі карнікамі на паўночнай ускраіне Жлобіна 1200 яўрэяў .

13 – 85гадоў **з дня растрэла 400 яўрэяў** са Стрэшынскага раена (1942).

15 – Міжнарожны дзень культуры

22 – 110 гадоў з дня нараджэння **Лазенкі Івана Аркадзьевіча** (22.04.1917 (па іншых звестках 6.06.1916) – 15.12.1943), Героя Савецкага Саюза (1944). Загінуў у паветраным баі за Жлобін. Пахаваны ў в.Скепня.

М А Й

100 гадоў з дня адкрыцця (1927) **Пірэвічскай сельскай бібліятэкі**.

100 гадоў з дня адкрыця (1927) **Акцябрскай сельскай бібліятэкі**.

3 – 85 гадоў з дня зацвярджэння (1942) Жлобінскага міжрайкома КП(б)Б.

14 – 60 гадоў з дня нараджэння (1967-1987) **Мікулкі Паўла Іванавіча**, удзельніка вайны ў Афганістане , ураджэнца г.Жлобіна. Пасмяротна узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

18 – 50 гадоў з дня адкрыцця (1977) Жлобінскага аграрна-тэхнічнага вышэйшага прафесійнага вучылішча (цяпер **Жлобінскі дзяржаўны прафесійны аграрна-тэхнічны каледж).**

18 – 80 гадоў з дня нараджэння **Рагаўцова Мікалая Мікалаевіча** (н. 18.05.1947, в.Старая Каменка Жлобінскага раёна), беларускага вучонага ў галіне оптыкі і прыкладной матэматыкі.

22 – 110 гадоў з дня нараджэння (1917-1991) **Петухова Аляксандра Прохаравіча,** Героя Сацыялістычнай Працы (1951), ураджэнца в.Пякалічы Жлобінскага раёна.

Ч Э Р В Е Н Ь

6 – 110 гадоў з дня нараджэння **Странакова Пракопа Авяр'янавіча** (6.06.1917, в.Грачухі Жлобінскага раёна – 12.10.1961), Героя Савецкага Саюза (1943).

11 – 65 гадоў з дня нараджэння (1962-1981), **Лукомскага Аляксандра Рыгоравіча,** удзельніка вайны ў Афганістане, ураджэнца г.Жлобіна. Пасмяротна узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

15 – 125 гадоў з дня нараджэння (1902-1941), **Пятроўскага Леаніда Рыгоравіча**, камандзіра 63-га стралковага корпуса. (Пахаваны ў в. Старая Рудня).

21 – 90 гадоў з дня нараджэння (1937) **Карабанава Ігара Арсеньевіча**, беларускага журналіста, педагога, кандыдата біялагічных навук, дацэнта, ураджэнца в. Мормаль Жлобінскага раёна.

29 – 20 гадоў з часу, калі быў адкрыты (2007) **мемарыяльны комплекс памяці дзяцей-ахвяр фашызму ў в.Чырвоны Бераг** Жлобінскага раёна.

Л І П Е Н Ь

9 – 100 гадоў з дня нараджэння (1927) **Зелянко Віктара Канстанцінавіча**,

токара лакаматыўнага дэпо, заслужанага чыгуначніка (1977).

14 – 60 гадоў з дня нараджэння (1967-1987) **Мікулка Паўла Іванавіча**, удзельніка вайны ў Афганістане, ураджэнца г.Жлобіна. Пасмяротна узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём "За адвагу".

18 – 35 гадоў з дня падпісання (1992) акта пабрацімства г. Жлобіна і італьянскага г. Скаленге.

20 - 215 гадоў з дня акупацыі (1812) Жлобіна і навакольных весак **напалеонаўскімі войскамі** .

24 – 115 гадоў з дня нараджэння (1912-1945) **Бярнацкага Дзмітрыя Васільевіча**, Героя Савецкага Саюза, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнца г.п.Стрэшын.

27 – 105 гадоў з дня нараджэння **Аўсянікава Сцяпана Рыгоравіча** (27.07.1922, в.Акцябр Жлобінскага раёна – 10.05.1983), беларускага вучонага-эканаміста., доктара эканамічных навук (1973), прафесара (1974).

Ж Н І В Е Н Ь

2 – 90 гадоў з дня нараджэння (1937) **Тамкова Льва Мікалаевіча** , беларускага архітэктара, заслужанага архітэктара Беларусі (1976), ураджэнца г.Жлобіна.

15 – 110 гадоў з дня нараджэння (1917-1945) **Кавалёва Мікалая Кузьміча**, Героя Савецкага Саюза, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнца вёскі Селіванаўка.

23 – 105 гадоў з дня нараджэння (1937) **Татарынава Аляксандра Цярэнцьявіча**, кандыдата медыцынскіх навук, заслужанага урача БССР (1968 г.).

В Е Р А С Е Н Ь

40 гадоў з часу заснавання (верасень, 1987) **Жлобінскага дзяржаўнага гісторыка-краязнаўчага музея** ў выніку рэарганізацыі Музея народнай славы, які дзейнічаў на грамадскіх пачатках з 1971 г.

1 – 60 гадоў з дня адкрыцця (1967) **сярэдняй школы №8 г**. Жлобіна / з 22.08.2001г. – лінгвістычная гімназія імя В.І. Казлова/.

13 – 90 гадоў з дня нараджэння (1937-2015) **Содаля Уладзіміра Ільіча** , беларускага пісьменніка, ураджэнца в. Мормаль.

16 – 130 гадоў з дня адкрыцця (1897) **Скепнянскай сярэдняй школы**.

17 – 105 гадоў з дня адкрыцця (1922) ў Чырвоным Беразе сельскагаспадарчага тэхнікума. /З 2002 года **Чырвонабярэжскі дзяржаўны аграрны каледж**/.

18 – 70 гадоў з дня стварэння (1957) саўгаса **“Пірэвічскі”** .

20 – 35 гадоў з дня адкрыцця (1992) **сярэдняй школы №12** г. Жлобіна .

20 – 60 гадоў з дня адкрыцця (1967) **гарадской бібліятэкі №2** г. Жлобіна

22 – 30 гадоў з дня адкрыцця (1997) **сярэдняй школы №13** г. Жлобіна

23 –80 гадоў з дня нараджэння (1947) **Шавыркіна Міхася Мікалаевіча**, беларускага журналіста, педагога, ураджэнца в. Дзяніскавічы.

24 – 85 гадоў з дня стварэння (1942**) партызанскага атрада "Смерць фашызму**", які дзейнічаў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

26 – 60 гадоў з дня нараджэння (1967-1987) **Валасовіча Алега Міхайлавіча**, удзельніка вайны ў Афганістане, ураджэнца г.Жлобіна. Пасмяротна узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

К А С Т Р Ы Ч Н І К

85гадоў з дня дзейнасці (1942) Жлобінскага падпольнага міжрайкома ЛКСМБ.

3- 65 гадоў з дня нараджэння **Мікалая Васільевича Шуканава**, пісьменніка, краязнаўца, журналіста, члена Міжнароднага саюза пісьменнікаў і майстроў мастацтва, лаўрэата абласной літаратурнай прэміі ў галіне прозы і публіцыстыкі імя А.П.Капусціна.

10 – 105 гадоў з дня нараджэння **Мірашнічэнкі Пятра Апанасавіча** (10.10.1922-1.01.1944), Героя Савецкага Саюза. Яго імем названа вуліца ў Жлобіне.

14 – 220 гадоў з дня адкрыцця (1807**) Стрэшынскага Свята – Пакроўскага храма**. /Памятнік архітэктуры класіцызма/

16 –105 гадоў з дня нараджэння **Быкава Міхаіла Сяменавіча** (1922-1991), Героя Савецкага Саюза, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнца г.Жлобіна.

20 – 190 гадоў з дня нараджэння і **95** год з дня смерці (1837-1917) святога Рускай Праваслаўнай Царквы правяднага **Іаана Кармянскага**, ураджэнца г.п. Стрэшын.

26 – 105 гадоў з дня нараджэння **Ганкіна Евеля Мордухавіча** (26.10.1922, в Шчадрын Жлобінскага раёна – 2.05.1996), беларускага мастака кіно.

Л І С Т А П А Д

20 – 90 гадоў з дня нараджэння **Фралова Рыгора Сямёнавіча** (н.20.11.1937, в.Закараў Жлобінскага раёна), мастака.

22 – 70 гадоў з дня нараджэння (1957) **Кірава Мікалая Іванавіча**, беларускага спартсмена (легкая атлетыка), ураджэнца г.п.Стрэшын.

С Н Е Ж А Н Ь

- 105 гадоў з дня нараджэння **Жуйкова Мікалая Пятровіча** (снежань, 1922 – 1.03.1944), удзельніка вызвалення Гомельшчыны. Загінуў у баі за вёску Мормаль, разам з П.М. Мазіліным закрыў амбразуру варожага дзота.

2 – 110 гадоў з дня абвешчання ў Жлобіне і Стрэшыне аб пераходзе ўлады да Саветаў рабочых і сялянскіх дэпутатаў. З дня стварэння ваенна-рэвалюцыйных камітэтаў (1917).

14 – 60 гадоў з часу заснавання (1967) завода па рамонту і будаўніцтву дарожных машын **“Жлобінскі рамонтна-механічны завод”** /цяпер Жлобінскі рамонтна-тэхнічны завод/.

15 – 50 гадоў з дня цэнтралізацыі (1977) **Жлобінскай раённай бібліятэчнай сістэмы.**

24 – 125 гадоў з дня адкрыцця (1902) руху паяздоў па участку Віцебск – Жлобін.

25 – 65 гадоў з дня далучэння (1962) **Шчадрынскага сельсавета Светлагорскага раена да Жлобінскага раена.**

25 – 120 гадоў з дня нараджэння **Дворкіна Зіновія Якаўлевіча** (25.12.1907, г.Жлобін – 1.06.1983), ваеннага дзеяча, генерал-лейтэнанта.